■ Традыцыі і сучаснасць



# СВЯТА МАЛАДОЕ!

## У сталіцы другі раз прайшоў Дзень вышыванкі






Фота БЕЛТА.

**У нашай краіне вышыванка з'яўляецца адным з нацыянальных сімвалаў. І калі яшчэ нядаўна арнамент часцей сустракаўся на нацыянальных касцюмах, то цяпер яго можна ўбачыць на майках, аўтамабілях і нават на татуіроўках беларусаў. Сёння вышыванка сапраўды ў модзе, што пацвярджае праведзены другі раз Дзень вышыванкі.**

У нядзелю ў 12 гадзін дня на пляцоўцы побач з Палацам спорту было даволі шматлюдна. Напярэдадні святочнай праграмы ўжо працавалі крамы, дзе гандлявалі таварамі з нацыянальнымі арнаментамі, якія сёння выклікаюць немалую цікавасць у беларусаў. Напрыклад, **Вадзім МАКЕЙ** ужо больш за год займаецца продажам адзення і аксесуараў з беларускімі нацыянальнымі сімваламі. «Чаму на таварах з'явілася вышыванка? Таму што гэта блізка да нас, да нашай душы. Я раблю ўсё гэта не дзеля бізнесу, а дзеля ідэі, — адзначыў бізнесмен. — Для мяне вышыванка — гэта беларуская аўтэнтычнасць, карані, якія сыходзяць у самы пачатак нашага народа, культуры. Самае галоўнае — трэба разумець, што мы з'явіліся не пасля развалу Савецкага Саюза. У нас вельмі глыбокая гісторыя, якой мы павінны ганарыцца».

Сёння ўзоры арнаменту можна сустрэць не толькі на майках і кубках — некаторыя тавары на свяце можна назваць сапраўды незвычайнымі. Напрыклад, у адной з імправізаваных крам прадавалася эксклюзіўная калекцыя ювелірных упрыгажэнняў. «Сёння гэтыя вырабы сапраўды вельмі папулярныя, — расказала **загадчыца сталічнага ювелірнага салона Анастасія МІРОНАВА.** — Але, на жаль, большай папулярнасцю такія ўпрыгажэнні карыстаюцца не ў беларусаў, а ў замежнікаў. Чаму так атрымалася? Жыхары замежных краін усё ж такі вязуць гэты тавар як сімволіку тых дзяржаў, у якіх яны пабывалі. А вышыванку адназначна можна назваць нашым сімвалам».

Немагчыма падлічыць усе нацыянальныя сімвалы, прадстаўленыя на свяце. Адным з такіх сімвалаў з'яўляюцца і ручнікі. «Мы іх больш не выробляем, а толькі прадаём, — падзялілася **арганізатар Азёрскага цэнтра культуры Гродзенскага раёна Аляксандра КУЛІК.** — Чаму не робім новыя? На жаль, майстроў, якія маглі гэта зрабіць, ужо няма, а



моладзь не надта рвецца займацца ручнікамі». Уменні і навыкі, якія здаўна перадаюцца з пакалення ў пакаленне, не павінны быць забытыя і страчаныя, упэўнена дзяўчына.

У адной з крам было вельмі шматлюдна: там прадаваліся лялькі, а таксама абярэгі. «Бачыце, якая папулярнасць, — яшчэ не паспелі як след расставіць тавары, а людзі ўжо набеглі, — усміхаецца **навуковы супрацоўнік Стрэнькаўскага цэнтра рамёстваў Рагачоўскага раёна Таццяна ЦЫРЫКАВА.** — Сапраўды, лялькі, абярэгі — усё гэта цесна звязана з беларускай гісторыяй. Ёсць розныя лялькі — сямейна-бытавыя, абрадавыя. Напрыклад, раней нашы бабулі рабілі абярэгі, каб абараніць сябе ад навальніцы ці іншай стыхіі».

Дарэчы, вельмі б спатрэбіўся ў Дзень вышыванкі абярэг ад дажджу. Непагадзь і невысокая тэмпература, напэўна, унеслі карэктывы ў планы многіх мінчан і гасцей сталіцы, бо не кожны захоча весяліцца і танцаваць у настолькі нялетняе надвор'е.

Урэшце, гэта не перашкодзіла правядзенню святочнай праграмы. У 13.30 праспект Пераможцаў уздоўж Палаца спорту ператварыўся ў імправізаваную плошчу, на якой прайшоў артпарад «Пад сцягам з вышыванкай». Свае таленты гледачам прадэманстравалі творчыя калектывы, духавыя і інструментальныя аркестры, фальклорныя калектывы, танцавальныя школы, тэатры, прадстаўнікі розных прафесій і нацыянальных культур. Акрамя таго, свае ўменні паказалі джамперы, скейтбардысты, ролеры, брэйкеры, хадулісты, бітбоксеры, хіп-хоперы, мастакі бодзі-арт, аўтары бардаўскай песні, поп-, рок-гурты, прадстаўнікі рыцарскіх клубаў і байкеры...



— Праз усе стагоддзі наша жыццёвае разуменне праходзіла праз беларускі арнамент, які цалкам сімвалізаваў усе напрамкі жыцця ў Беларусі, адносіны да прыроды, блізкіх, продкаў, стаўленне да перамог і паражэнняў, — адзначыў на адкрыцці свята **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ.** — І вельмі важна, што праз многія стагоддзі мы захавалі нацыянальны арнамент. Мы захавалі яго праз культуру і мастацтва, праз нашу дарагую вышыванку. І я ўпэўнены, што ў кожнага беларуса гэты арнамент ёсць у сэрцы.

— Мне здаецца, што гэта свята не толькі для БРСМ, але і для ўсіх нашых людзей. Гэта свята гонару, свята культуры і традыцый беларускага народа, — упэўнены **першы сакратар цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Андрэй БЕЛЯКОЎ.** — І гэта свята, якое аб'ядноўвае абсалютна ўсіх — тых, хто пражывае не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і за межамі нашай краіны. Хочацца, каб у такія дні беларусы ўспаміналі нашу культуру, нашы традыцыі і гісторыю. Хочацца, каб вышыванка аб'ядноўвала і засцерагала нас і надалей.

Падчас Дня вышыванкі адбылося дэфіле мадэляў «Вянок прыгажосці» ў касцюмах ад беларускіх дызайнераў і вытворцаў, унікальны гістарычны квэст «Мая Беларусь», спаборніцтвы па розных відах спорту «Алімп» і многія іншыя мерапрыемствы. Вядома ж, не абышлося без музычнага суправаджэння, якое арганізавалі ансамбль «Песняры», заслужаныя артысткі Рэспублікі Беларусь Ірына Дарафеева, Іна Афанасьева, Вікторыя Алешка, гурты «Аўра», «Дразды», «Правакацыя» і іншыя. Асабліва цёпла госці свята сустрэлі групу Naviband, якая зусім нядаўна прадстаўляла Беларусь на Еўрабачанні.

— Мы з першай нашай песні спяваем на беларускай мове, — нагадаў **вакаліст Naviband Арцём ЛУК'ЯНЕНКА.** — Мы адчуваем сваю місію: не толькі спяваць, але яшчэ і быць прыкладам для моладзі. Так, у нас ёсць вышыванкі, і мы выкарыстоўваем іх на нашых канцэртах, бо вельмі любім і паважаем сваю гісторыю.

Свята завяршылася традыцыйнай дыскатэкай і бітвай беларускіх дыджэяў. Нягледзячы на не вельмі спрыяльнае надвор'е, на Дні вышыванкі было сапраўды ўтульна — людзі змаглі стварыць атмасферу весялосці і цяпла.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*

■ Гэта цікава

# НАТХНЁНАЯ СІНЯВОКАЙ...

## Дызайнер з Тайланда стварыла калекцыю адзення з беларускімі арнаментамі

**Сёння ў нашай краіне нікога не здзівіць вышываная кашуля ці сукенка з традыцыйнымі беларускімі матывамі — вышыўкай, тканінай, фактурай. Хваля захаплення этнічным тут ператварылася ў сапраўдны модны трэнд. Таму і навіна пра новую калекцыю, якая падае этніку ў не зусім звыклым ключы, спачатку не выклікае здзіўлення. Але ўсё змяняецца, калі даведваешся, што такія смелыя рашэнні ў выкарыстанні нашых традыцыйных колераў, матываў, асобных элементаў арнаменту характэрныя для рэчаў, створаных дызайнерам Сіці СІЦІРАД з Бангкока.**



— Як вы маглі здагадацца, у Паўднёва-Усходняй Азіі пра Беларусь пачуеш нячаста, — расказвае Сіці. — Але дзякуючы сацыяльным сеткам у мяне ёсць сябры з вашай краіны. Час ад часу ў чаце яны апавядаюць пра Беларусь, дасылаюць сувеніры. Гэта дапамагло мне зразумець, што паміж беларускай, рускай, украінскай культурамі ёсць адрозненні. І гаворка не толькі пра мову, але і пра адметныя рысы.

Як кажуць, адметнасці лепш бачацца здалёк, таму і дызайнерскія рашэнні, прынятыя Сіці, падаюцца сапраўды нечаканымі. Прынамсі, для вока беларуса, звыклага мысліць, абапіраючыся на традыцыйныя ўяўленні пра арнамент і спосабы яго выкарыстання.

— Я мастачка-рамесніца ці, прынамсі, магу сябе так назваць, — тлумачыць дызайнер. — Мяне натхняе штодзённасць, а таксама цікавяць спосабы ўпісаць традыцыйныя матывы ў сучаснае жыццё. Напрыклад, не так даўно я набыла японскае кімано і ператварыла яго ў новае адзенне. Або для вырабу зімовых паліто выкарыстоўваю тайскі шоўк ці саматканую бавоўну. Калі мне падарылі кнігу, прысвечаную традыцыйным беларускім касцюмам і арнаментам, я была крыху здзіўленая. Тут пабачыла класічнае спалучэнне чырвонага і белага колераў, адрознае ад уяўлення пра «сінявокую Беларусь», што мела дагэтуль. Але падумалася: выдатна, калі людзі, якія жывуць у акружэнні прыгожых пейзажаў, носяць такое адзенне. Таму і сама пачала вывучаць матывы арнаментаў, некаторыя запазычыла.

Ці быў страх нешта зразумець няправільна, не зусім карэктна ўжыць вобраз ці асобны элемент?

— Мне сапраўды спадабалася працаваць з беларускімі матывамі, я пачувала сябе вольнай і не думаю, што ў нечым цалкам мела рацыю ці памылілася. Вядома, я адчуваю павагу да культуры і крыху баюся рэакцыі, бо не ведаю, што самі беларусы скажуць пра маю калекцыю. Ці будзе для іх яна ў цэлым выглядаць як натхнёная Беларуссю.

На пытанні, хто ж будзе насіць гэтыя рэчы і ці завяршыла яна работу над калекцыяй, Сіці адказвае:

— Мае работы заўсёды ў адзінкавым экзэмпляры, таму іх пакупнікі хутчэй — калекцыянеры мастацтва. Калекцыя ніколі не з'яўляецца адразу цалкам, таму магу з упэўненасцю сказаць, што яна будзе дапаўняцца новымі рэчамі. Мне ж яшчэ столькі хочацца зрабіць!




За творчасцю Сіці Сіцірад можна сачыць у яе блогу www.thehandmadediary.com. Дарэчы, з нядаўняга часу, дзякуючы беларускім сябрам дызайнера, ён займеў і беларускамоўную версію.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Мы разам — Беларусь!

# ЯК НАДОЎГА ЗАРАДЗІЦЬ БАТАРЭЙКУ...

**...ведаюць школьнікі, якія сабраліся пад Рагачовам не толькі для таго, каб паспяваць песні каля вогнішча. Сёння на іх ускладзена сур'ёзная роля медыяцыі. Калі справяцца, дарослыя суседніх дзяржаў хутчэй прыйдуць да паразумення.**

**Турыстычныя палаткі дзіцячага лагера на беразе возера Добрае, што на Рагачоўшчыне, былі пастаўлены ўпершыню ў 1992 годзе. Гэта быў сумны год адразу пасля развалу былога магутнага Саюза. Тады ніхто не мог і марыць, што праз чвэрць стагоддзя міжнародны лагер міру і дружбы дзяцей і моладзі славянскіх народаў «Крынічка» стане выконваць ролю аб'яднання нашчадкаў тых, хто шкадуе аб страчаным адзінстве славянскіх народаў.**



Каля вёскі Ходасавічы 300 удзельнікаў з Беларусі, Расіі і Украіны разбілі палатачны лагер і сёлета. Дарэчы, калі палічыць, атрымліваецца, за час існавання тут пабывала каля 7500 падлеткаў. Мікалай Ананенка прыехаў у міжнародны лагер чацвёрты раз. Юнак са Смаленска толькі закончыў школу і рыхтуецца паступаць у ВНУ на спецыяльнасць «гісторыя і права». Гаворыць, што вопыт суіснавання ў паходных умовах стварае асаблівую атмасферу, дзе няма месца непаразуменню:

— Штогод прыязджаю па новыя ўражанні. Мы тут сустрэлі знаёмых, якія былі ў мінулыя гады, і знайшлі новых. Розныя людзі прыязджаюць сюды з гарадоў Расіі, Беларусі і Украіны. Мне здаецца, гэта прыемны і важны вопыт стасункаў. Цікава ж размаўляць з людзьмі, якія маюць, магчыма, іншы светапогляд. Увогуле, карысна ведаць, якім чынам развагаюць іншыя людзі. Ну, а пакуль мы пад гітару ўспомнілі ўвесь асноўны рэпертуар «Крынічкі».



Між тым тут ёсць свая топавая песня, напісаная групай «Жукі» яшчэ ў 1999 годзе. «Батарэйку» спявала іншае пакаленне юнакоў. Песню пра каханне, якое некалі заканчваецца, перажываюць і сённяшнія падлеткі. Вось і каля іншага беларускага вогнішча яна таксама гучала.



Насця Ксяндзова не першы год у лагеры. Школу закончыла, тэсты здала і прыехала адпачыць у лагер з самага блізкага гарадка — Рагачова:

— Тут вельмі цёплая атмасфера. Мы штогод знаходзім дзякуючы гэтаму лагеру новых сяброў. Потым падтрымліваем кантакты ў сацыяльных сетках. Асаблівыя стасункі ў нас склаліся з рабятамі з каманды горада Курска. Дружба славянскіх народаў — гэта вельмі важна для ўсіх.





Калі расіяне прадстаўлены сямю атрадамі, беларусы — сямнаццаццю, то ўкраінскіх хлопчыкаў і дзяўчатак у лагеры сёлета няшмат. Адзін атрад з васьмі школьнікаў і двое дарослых прыехалі з Навагmales-Валынскага Жытомірскай вобласці. Марыя Кальчанка таксама не навічок у гэтым лагеры. Дзяўчына прыехала трэці раз і разумее навошта:

— Пасля першага разу эмоцыі мяне перапаўнялі. Людзі вельмі адкрытыя і прыязна ставяцца да ўсіх. Зноў хочацца перажыць такія добрыя пачуцці. Хочацца знайсці новых суразмоўнікаў, аднадумцаў. Мы рыхталіся да конкурсаў, якія тут будуць ладзіцца. Вучылі песні, танцы. У нас былі вясёлыя рэпетыцыі — мы прыдумвалі і потым змянялі ўсё, але ж спадзяюся, што вынік спадабаецца. Беларускую мову мы разумеем, але ж кніжкі чытаем і фільмы глядзім расійскія. А ў жыцці часцей размаўляем па-ўкраінску. Мы валодаем абедзвюма мовамі, і ніводная не перашкаджае. Наадварот, добра, калі можаш з большай колькасцю людзей знаходзіць агульную мову і разумець іх.

Кіраўнік расійскага атрада Ірына Радкевіч з Санкт-Пецярбурга ў міжнародным лагеры ўпершыню. Пакуль што прыстасоўваецца да абстаноўкі, але ж самае першае ўражанне ўжо склалася:

— За дзень агледзеліся. Вельмі гасцінныя тут людзі, якія адразу ж прыходзяць на дапамогу. Нас нават у Рагачоў звазілі. З украінцамі ўжо мелі стасункі. Усё нармальна, без праблем.

— Калі дзеці будуць сябраваць, то нешта зменіцца і ў стасунках дарослых людзей, — лічыць **старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Беларускага фонду міру Цімафей ГЛУШАКОЎ.** — Дзеці ўсё тут робяць самі: сякуць дровы, гатуюць ежу. Мы арганізоўваем дні нацыянальнай культуры, кухні, гумару... Ёсць дзень, калі на тэрыторыі лагера нельга знаходзіцца без маскараднага касцюма. Тут праходзяць спаборніцтвы паміж дарослымі і дзецьмі. Дзеці, калі ад'язджаюць, заўсёды просяць аб наступнай сустрэчы.

Змена зараз у самым разгары. Яшчэ ёсць час для правядзення фестываляў творчасці, спартыўных свят, інтэлектуальных конкурсаў і дня міру. Трэцяга ліпеня ўсе дзеці прынялі ўдзел у святочных мерапрыемствах, прысвечаных Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і святу 875-годдзя Рагачова. **Старшыня праўлення грамадскай арганізацыі «Беларускі фонд міру», дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Максім МІСЬКО** кажа, што вельмі важна, што медыяцыяй пачынаюць займацца дзеці:

— Гэты лагер вяртае нас у дзяцінства, і сапраўды хочацца ўспомніць тыя часіны, калі мы жылі больш сэрцам, а не розумам. Мы не ведалі дарослых праблем, і ў нас не было меж для стасункаў. Гэта якраз тое, што здзяйсняецца і тут. У нашай краіне, якая так многа цярпела, арганізавана пляцоўка для дзіцячай міратворчасці. Псіхолагі ведаюць, што дзецям важна адчуць эмоцыі, каб потым, праз пэўны час, яны спрацавалі як ідэі і далей рэалізоўваліся ў дзеяннях. У сэрцах падлеткаў, якія тут сабраліся, няма канфлікту і варожасці. Дзіцячая міратворчасць можа сыграць больш глабальную ролю ў рашэнні нейкіх канфліктных пытанняў, чым нават вялікая палітыка.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*